# Чарацянцы патрэбныя чароты.

У Беларусі пачалася рэалізацыя праекта Праграмы развіцця ААН па захаванні балот Кліма Іст".

Мэта разлічанага на чатыры гады праекта — аднаўленне нізінных балот "Званец" і "Спораўскае" ў Брэсцкай вобласці, асноўных месцаў гнездавання на тэрыторыі Беларусі вяртлявай чарацянкі, занесенай у Чырвоную кнігу краіны. Акрамя таго, вяртлявая чарацянка прызнаная ва ўсім свеце відам, які знаходзіцца пад глабальнай пагрозай. "Такі статус від атрымаў у сувязі з нізкай колькасцю папуляцыі, якая пастаянна скарачаецца" — адзначыла начальнік упраўлення Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Наталля Мінчанка.

Паводле апошніх дадзеных, у краіне налічваецца ўсяго 6-8 тысяч прадстаўнікоў рэдкага віду, прычым колькасць чарацянкі працягвае скарачацца. Нармальная для тэрыторыі Беларусі колькасць гэтых птушак, паводле ацэнак спецыялістаў Мінпрыроды, — не менш за 50 тысяч асобін.

**Источник**: Беларусь. — 2014. —№ 3. —С. 9.